Цана асобнага нумару 20 гр. | Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 5 | Вільня, Нядзеля 7 Лютага 1932 г. | Год VIII (XVI)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Грымоты на Далёкім Усходзе і вялікія дзяржавы.

На Далёчім Усходзе грыміць штораз мацней. Водгукі гэтых грымотаў разыходзяцца па ўсім сьвеце, насоўваючы кожнаму пытаньне, што з гэтага будзе?

Калі Японія займала Манджурыю, кітайцы не супраціўляліся моцна і адступалі, спадзяючыся, што Ліга Народаў, або Амэрыка з Саветамі заступяцца і прымусяць Японію ў імя сусьветнага супакою і справядлівасьці прыпыніць ваенныя крокі. Аднак спадзяваньні кітайцаў не апраўдаліся. Японія, пасьля заняцьця паўднёвай Манджурыі, сьціравалася ў Паўночны і нават... у Цэнтральны Кітай, дзе заняла горад Шанхай, не зварочваючы ўвагі на ўсе напамінаньні Лігі і пратэсты Амэрыкі.

Цяпер ужо і ў кітайцаў не хапіла цярплівасьці і яны, хоць слаба ўзбраеныя і здэзарганізаваныя, пачалі бараніцца ад свайго суседа з усей сілы. Бітвы ў Шанхаі належаць да найболей крывавых з усей японска-кітайскай вайны.

Але нас тут інтэрэсуе ня так сам працэс займаньня Шанхаю і бітвы, якія адбываліся пры яго займаньні, колькі інтэрэсуе нас пытаньне, як аднясьліся да гэтага вялікія дзяржавы: якія стаяць за Японіяй, а якія — за Кітаем?

За Японіяй стаіць бясспрэчна Францыя. Францускі ўрад даўней, калі міністрам заграничных спраў быў Брыян, стараўся хоць паказваць від, што ён ня хоча вайны паміж Японіяй і Кітаем. Цяпер-жа, калі Брыян пайшоў у адстаўку, а ягонае месца заняў Ляваль, сябра „нацыянальнай правіцы“ і блізкі да ваеннай партыі, Францыя нават перастала гаварыць аб сваёй „міралюбівасьці“, а прымае да ведама ўсе выясьненьні Японіі За Францыяй ідуць усе яе саюзьніцы: Польшч, Чэхаславаччына, Румынія, Югаславія.

Паддзержывае Японію (хоць ня так адкрыта) і Англія. Гэта дзяржава заўсёды іграла і цяпер іграе двузначную і фальшывую ролю: яна з аднаго боку ня хоча парваць з сваёй адвечнай саюзьніцай Японіяй, а з другога боку — ня хоча загнявіць і сваю магутную заакіянскую суседку—Злуч. Штаты Пўн. Амэрыкі. Усе яе сымпатыі, здаецца, па старане Японіі, але яўна гэтага „хітрая Англічанка“ не паказвае. Яна ня можа забыцца сваіх нядаўніх спраў в Амэрыкай ва роўнасьць марскіх флётаў, ня можа забыцца сваёй няўдачы ў 1929 г., калі Мэкдональд езьдзіў асабіста да гордых Штатаў у справе спыненьня будаваньня новых ваенных караблёў. Апроч гэтага Англія ня можа дабіцца ад Амэрыкі дараваньня ваенных даўгоў. Усё гэта схіляе сымпатыі Англіі на бок Японіі. Урэшце Англія хацела-б сьціраваць Японію на Саветы.

А хто-ж процiў Японіі?

Процiў Японіі яўна і адкрыта выступаюць Злуч. Штаты П. Амэрыкі, а паціхоньку і Саветы. Паміж Японіяй і Амэрыкай ідзе заўзятае змаганьне за уплывы ў Кітаі і на ўсім Ціхім акіяне. Японія ня можа забыцца забароны, якую выдала Амэрыка ў справе эміграцыі ў Амэрыку японцаў, а так-жа ня можа перанесьці апанаваньня Амэрыкай рынкаў Кітаю; Амэрыка ізноў баіцца, што Японія, пасьля заўладаньня Кітаем, выпрэ адтуль амэрыканскія тавары і можа заўладаць Філіпінскімі выспамі, якія належаць да Амэрыкі. Адвечная ненавісьць і антаганізм паміж гэтымі краямі праяўляюцца цяпер з усей сілай. Аднак і адна старана і другая абмяжоўваюць сваю дзейнасьць да высылкі папяровых нот: Амэрыка пратэстуе процiў заняцьця Японіяй Манджурыі і Шанхаю і пагвалчэньня свабоды гандлю (так зв. „адкрытых дзьвярэй“), Японія-ж з свайго боку адказвае, што яна пакідае ў Манджурыі і Кітаі „дзьверы“ адкрытыя для кожнай дзяржавы і што ўжо ня думае займаць гэтых краёў назаўсёды...

Як разаўюцца далейшыя падзеі паміж Амэрыкай і Японіяй—будзем глядзець, а цяпер зьвернемся да палітыкі Саветаў. Саветы баяцца Японіі і ў вайну ня лезуць, але і Японія, ня ведаючы, як паступяць Злуч. Штаты, ня хоча дражніць Саветаў, каб на выпадак вайны з Амэрыкай, ня мець яшчэ аднаго ворага. Японія заўсёды цьвярдзіць (хоць ёй ніхто ня верыць), што адносна Саветаў ня мае ніякіх зачэпных плянаў, што ўшануе Савецкія правы на ўсходня-кітайскай чыгунцы, што хоча жыць у згодзе з усімі сваімі суседзямі, а толькі карае кітайскіх „бандытаў“ і г. д., але пакту аб ненападаньні заключаць з Саветамі ня хоча...

Гэтак прадстаўляецца палітычнае палажэньне на Далёкіл Усходзе, адкуль аж да нас далятаюць водгукі тамашніх ваенных грымотаў ужо ня толькі ў Манджурыі, але і ў Шанхаі. Згоднага і шчырага выступленьня вялікіх дзяржаў, з пратэстам процiў заняцьця Японіяй Шанхаю, спадзявацца ня трэба; з усяго відаць, што яго ня будзе, так як ня было ў справе Манджурыі. Амэрыка ўжо нават не зварочваецца да Францыі з ніякімі прапазыцыямі, а толькі да Англіі, веручы яшчэ, а можа прабуючы бесстароннасьць гэтай апошняй. Аднак англійскі афіцыёз „Таймс“ піша адкрыта, што „пункты гледжаньня Англіі і Амэрыкі на кітайскія справы зьяўляюцца зусім неаднальковымі“.

Пазнаўшы адносіны вялікіх дзяржаў да японска-кітайскага канфлікту, лёгка можам зразумець і нявыразнае становішча да гэтага канфлікту Лігі Народаў. У Лізе Народаў сядзяць прадстаўнікі гэтых самых вялікіх дзяржаў, якія так лоўка разыгрываюць свае ролі адносна Японіі і Кітаю. Як там пагляды вялікіх дзяржаў разыходзяцца, таксама і ў Лізе Народаў.

Аб‘яднаньне Літоўцаў.

У жыцьці віленскіх Літоўцаў апошнім часам стаўся факт годны грамадзкай увагі. Фактам гэтым зьяўляецца аб'яднаньне двух літоўскіх палітычна-грамадзкіх кірункаў (гр. К. Сташыса і др. Д. Альсэйкі), між якімі, нешта на працягу чатырох гадоў, трывала то больш, то менш выразнае непаразумленьне.

Непаразумленьне гэта ў Літоўскім грамадзянстве вядзе свой пачатак ад кастрычніка месяца 1927 г. У гэтым годзе, як прыпамінаем, уночы з 4 на 5 кастрычніка ў Вільні і на правінцыі была арганізавана аблава на літоўскае грамадзянства. У рэзультаце гэтай аблавы аказаліся арыштаванымі да 15 літоўскіх ксяндзоў, і больш 10 дзеячоў сьвецкіх, пераважна вучыцялёў, а так-жа было тады польскімі ўладамі закрыта нешта да 50 літоўскіх школ, а ў іх ліку і Літ. Вучыцельская Сэмінарыя ў Вільні.

Пасьля гэтых сумных падзеяў польскія палітыкі пачалі літоўцам падсоўваць думку, што з боку польскага на Літоўскую культурную і агулам прасьветную працу, а так-жа нават на новае адкрыцьце вучыцельскай сэмінарыі ня было-б перашкод, калі-б справай гэтай занялося не т-ва „Rytas“, да якога польскі ўрад ня мае даверу, але каб якое новае таварыства.

Вось-жа тады паўстала сапраўды новае літоўскае таварыства „Kultura“, каля якога згуртавалася, на чале з др. Д. Альсэйкам, тая часьць літоўскага грамадзянства, якая паверыла ў тое, што гэтаму новаму культурна-прасьветнаму таварыству сапраўды ўдасца наладзіць узноў закрытыя літоўскія школы, а так-жа ўдасца адкрыць Літоўскую Вуч. Сэмінарыю.

Вось-жа ў рэзультаце аказалася, што гэныя польскія Літоўцам падшэпты аб магчымасьці культурна-прасьветнай працы новаму таварыству былі звычайнай хлусьнёй. Т-ву „Kultura“, дзякуючы няспрыяўшым да яго адносінам польскіх уладаў, не ўдалося наладзіць ані літоўскіх школ, калі ня лічыць толькі некалькіх, ані тым больш — адчыніць Літ. Вуч. Сэмінарыю.

У выніку ўсяго гэтага сярод літоўскага грамадзянства паўстала ўзаемнае нездаволеньне, а нават раздваеньне. Палякі, такім чынам, дасягнулі таго, чаго жадалі.

Тымчасам 31.XII.31 году сталася нешта падобнае да таго, што было 4—5.X.27. У гэтым часе, як ведаем, польскія ўлады закрылі 10 літоўскіх школ, а нядзелі дзьве-тры пазьней, загадалі сярод літоўскага грамадзянсва на правінцыі, рэвізіі і арышты.

Надта магчыма, што на гэты раз польскія палітыкі спадзяваліся ўзноў выступаць з абяцанкамі да літоўскага грамадзянства і ў рэзультаце дакананць сярод яго яшчэ глыбейшага непаразумленьня і падзелу.

Але калі палітыкі гэныя так думалі, дык яны моцна ашукаліся. Закрыцьце апошнім часам літоўскіх школ, рэвізіі і арышты былі добрай аказіяй для літоўскага грамадзянства да ўзаемнага аб‘яднаньня, дзеля супольнай барацьбы за свае сьвятыя культурна-грамадзкія правы.

Так яно і сталася, 26.I.32 г. адбыліся перавыбары Літ. Тымч. Нацыян. К-ту, у прэзыдыюм якога ўвайшлі: К. Сташыс, як старшыня, а др. Д. Альсэйка і Кс П. Краўяліс, як заступнікі старшыні. А гэткі склад прэзыдыюму — гэта ўжо вымоўны знак аб унутраным аб‘яднаньні літоўскага грамадзянства.

Сталася такім чынам у Літоўцаў тое, што стацца мусіць у кожным даспелым, сьведамым сваіх абавязкаў і мэтаў, грамадзянстве.

М. Б.

Полёнізацыя праз Унію?

Даведваемся з пэўных жарол, што былая уніяцкая царква і манастырскія муры ў Супрасьлі, Беластоцкага пав., пераходзяць у валаданьне айцоў Міхалітаў, *Палякоў* з Галіччыны. Айцы гэтыя маюць заняцца працай унійнай сярод мясцовага беларускага насельніцтва.—Дык ці ня думаюць духоўныя ўлады, ад якіх гэта справа залежа, праз унію польшчыць беларусаў?

З газэт.

Чорная сотня аб'едныяваецца.

Мы ўжо прывыклі да чорнасоценскіх выступленьняў „Dz. Wil." адносна беларусаў, так што не зварочваем на іх увагі, але цяпер заўважваецца падмога для польскай чорнай сотні з боку расейскай і то — дзівіцца трэба — з боку „Нашего Времени". І так, у № 24 гэтай газэты ёсьць перадрукаваны з „Dz. Wil." адрывак стацьці, у якой гаворыцца так: „мы ня ведаем, што болей шкоднае ў працы ўніяцкіх місыянэраў: русыфікацыя, ці тварэньне фікцыі нейкай беларускай мовы, *якой фактычна няма*". Гэту глупую зацемку „Dz. Wilenskaha" аб неісnаваньні беларускай мовы „Наше Время" перадрукавала падкрэсьліла і назвала разумнай.—Ці ж ня поўная салідарнасьць і аб'яднаньне польскай чорнай сотні з „Dz. Wil." і расейскай з „Наш. Времени"? „Нашавременцы", куды вы дакаціліся? Вы ня толькі пашлі па дарозе Салавевічаў і Кавалюкоў, але яшчэ „лобызаетесь" з панам Обстам! — Шчасьлівай дарогі!

Пачынаюць разумець.

„Kur. Wil." у № 19 с. г. памясьціў цікавую стацьцю пад заг. „Касьцёл — духавенства — народ", у якой гаворыць аб апанаваньні Кат. Касьцёла польскім эндэцкім духавенствам, каторае болей увагі зварочвае на палітыку, чым на рэлігійныя справы. Як рэзультат гэтага — поўнае зьдзічэньне нашай вёскі. Каб падняць гэту вёску на вышэйшую маральную ступень, „Kur. Wil." радзіць паміж іншым прамаўляць да беларускага народу, пры навучаньні рэлігіі, пабеларуску.

Ад сябе дадаём, што мы заўсёды стаялі на гэтым становішчы, выказваючы ўсю бескарыснасьць, а нават шкоднасьць навучаньня народу рэлігіі ў чужой мове і цяпер вельмі цешымся, што людзі, пры аб'ектыўнай обсэрвацыі, даходзяць да тыхсамых вывадаў, што і мы.

р.

З беларускага жыцьця.

Ізноў перашкоды ў беларускай працы. З абшару Ашмянскага пав. даведваемся аб паноўных перашкодах у беларускай культурна-прасьветнай працы. Гэтак, Шутаўскі Гурток Б. І. Г. і К быў прыгатовіўшы на дзень 30 м. м. прадстаўленьне ў в. Сьвірыдавічах, паклаў на гэта кошты матэр'яльныя і пасьля ўсяго гэтага... не адтрымаў дазволу ад свайго Ашмянскага Старасства, бо п'еса, быццам, была паслана ў Вільню (аж у Вільню?!) да цэнзуры ды не пасьпела стуль вярнуцца. Выходзіла-б з гэтага, што ў Ашмяне няма цэнзара да беларускіх кніжак ды што... вінавата „Вільня."

Аднак-жа і „Ашмяна", пры найменшым, „не бяз грэху:" на просьбу Цэнтр. Ураду Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры аб дазволе наладзіць у тых-жа Сьвірыдавічах на той-жа дзень 30 м. м. папулярную лекцыю, адпаведны дазвол у Вільню, праўда, прышоў, але дасло ўна за няцэлыя 3 (тры) гадзіны (так!) прад ад'ездам у старану Сьвірыдавіч (86 клм.) апошняга цягніка, каторым мог-бы выехаць туды з Вільні адпаведны лектар. А просьба была выслана за два тыдні прад 30.І. с г..

Ёсьць пасьля гэтага прычына думаць, што ўрадавыя, як „Вільня," так і „Ашмяна" аднолькава адносяцца да культурнай працы, калі толькі яна беларуская.

Міма ўсяго гэтага лектар з Вільні ў Сьвірыдавічы ўсё-ж дыкі пасьпеў выехаць і лекцыя адбылася.

— У Будславе, Вялейскага пав. дня 31 г. м., стараньнем мясцовага Гуртка Б.І.Г. і К., была сарганізавана публічная лекцыя на тэму „Лекі на зьдзекі," якую ў гмінай залі прачытаў віцэ-старшыня Цэнтр. Ураду Бел. Інст. Г. і К. інж. Клімовіч з Вільні. Увечары таго ж самага дня у в. Палесьсе каля Будслава адбылося беларускае прадстаўленьне. Пастаўлены былі п'есы: „У кавалёвай хаце" Л. Родзевіча і „Першыя ластаўкі" — Рушчанца.

—7 г. м. стараньнем таго-ж Будслаўскага Гуртка Б. І. Г. і К. будзе зладжана ў вёсцы Алешкі мясцовымі сіламі яшчэ адно беларускае прадстаўленьне. Пастаўлены будуць п'есы: „Чорт і баба" і „Лекары і лекі."

З выдавецкай нівы. „Шлях Моладзі" № 1 — 1932 год, вышаў з друку. Зьмест — пашыраны і цікавы. У параўнаньні з папярэднімі гадамі, сёлетні „Шлях Моладзі" цікавы тым, што зьмест яго пашыраны на аддзелы: краязнаўчы (разам з этнографічным), таварыска - ўзгадаваўчы і прыродазнаўчы. Часьць матэр'ялу друецца гражданкай, а часьць — зрэформаванай лацінкай (č, š, v,). Падпіска асталася тая самая, г. зн. толькі 2 злоты ў год. Адрэс Рэдакцыі: Wilnia, Zawalnaja 6—10.

„Chryścijanskaja Dumka." Часопісь беларусоў-каталікоў, № 1—32 г. Гэта часопісь у сёл. годзе будзе выходзіць як пашыраны месячнік, замест дагэтуляшняга двутыднёвіка.—Адрэс: Wilnia, zawuł. św. Mikałaja 8—3. — Усе гэтыя друкі, як і ўсе дагэтуль вышаўшыя з друку беларускія кнігі і газэты можна дастаць праз Бел. кнігарню „Pahonia" Wilnia, Zawalnaja 6—10.

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

Дзесяці-гадавы юбілей творчасьці поэта Андрэя Александровіча абходзілі менскія камуністы 18 XII.31. Александровіч праславіўся тым, што ў паэме „Цеві на сонцы" выступіў проціў іншых бел. культурных дзеячоў, якіх замкнулі ў вастрозе, а потым выслалі з граніц БССР: Ластоўскага ў Уфу, Некрашэвіча ў Самару, Г. Багдановіча ў Вятку, І. Савіцкага (б. старшыню Віленскага Нацкому) ў Башкірыю і г. д. Юбілянту прыслалі прывеаты і пажаданьні ўсе вышэйшыя ўрадаўцы БССР. Александровіч быў некалі „нац. дэмократам", але потым пакаяўся і пачаў бэсьціць сваіх таварышаў. За гэтае здабыў ён ласку ў камуністаў. Александровіч радзіўся ў 1906 г. у Менску, у сям'і шаўца. Цяпер ён мае толькі 26 гадоў.

Будуюць. У Крычаве будуецца цяпер вялікі цамэнтны завод-гігант, які адвак яшчэ ня пушчаны ў ход дзеля нястачы патрэбных прыладаў; у Касьцюкоўцы (18 клм. ад Гомеля) будуецца вялікая шкляная гута, якая так-жа ня пушчана ў рух дзеля нястачы агнятрывалых матэр'ялаў; у Вярхоўі (10 клм. ад Вцебску над Дзьвіной) будуецца завод для апальваньня вапнавага коміна. Апроч гэтага будуецца яшчэ некалькі электрычных станцыяў, а ў Гомелі—фабрыка сельскіх машын (Гомсельмаш).

Праграма будаўніцтва „Сельбуду" ня выканана. І так: у будаўніцтве сьвінарнікаў праграма выканана толькі на 27 проц., кароўнікаў і цялятнікаў — на 20 проц., у бягучым рэмонце МТС (машына-трактарных станцыяў) на 42 проц., а ў буйным рэмонце нічога ня зроблена. „Прарывы" ў працы тлумачацца непарадкам у арганізаваньні рабочай сілы і недахватам матэр'ялаў.

Здыхаюць коні. Атрымаўшы трактарную сілу, сяляне перасталі цаніць коні і даглядаць іх. Аднак камуністычная ўлада стаіць на іншым становішчы, яна ўважае, „што толькі правільнае злучэньне конскай і трактарнай сілы можа павысіць прадукцыйнасьць сельска-гаспадарчых работ". Затым пачала караць тыя калгасы, дзе заўважыла дрэнныя адносіны да каня. А дрэнных адносінаў было многа — і так: у калгасах „Шлях да сацыялізму", „Чырвоны кастрычнік" і інш., а ў калгасе „Чырвоны май" Капыльскага раёну коняй загналі ў асобны хлеў, каб яны там паздыхалі.

„Сав. Бел." (23.XII.31.) заклікае сьледчыя ўлады пасадзіць такіх шкоднікаў на лаве падсудных, а калгасы — да скасаваньня абязьлічкі: „Каня трэба прымацаваць на доўгі час да аднаго канюха, да таго калгасьніка, які на ім працуе" — кажа „Сав. Беларусь".

Новы падаходны налог аб'яўлены ў гэтых днях. Ён сьціраваны проціў кулакоў і гандляроў, якія прымушаны будуць два разы болей плаціць, чым плацілі дагэтуль. Савецкія чыноўнікі маюць плаціць 30 проц. ад свайго жалаваньня. Тыя, што бяруць менш як 75 руб. у месяц, ад налогу звольнены.

Ад. Клімовіч:

4)

І культура і палітыка.

(Рэфэрат прачытаны на Зьезьдзе БХД 13.XII.1931 году),

VIII.

(Працяг.)

Адны ўздабываюцца на вышыню жаданьня маральнасьці сучаснага грамадзянства і адначасна пазваляюць на немаральныя прадстаўленьні і гэткую-ж прэсу ды жыцьцёвую практыку; іншыя — хацелі-б нават грамадзянства „хрысьціянізаваць", накідаючы яму формы, але... адбіраючы адначасна хрысьціянскія засады і пасьля наракаюць на... „бяссільнасьць" гэтага-ж хрысьціянства.

Наракаюць людзі сягоньня на агульна-гаспадарчы крызыс-ліхалецьце, шукаюць ягоных прычын усюды, але баяцца заглянуць у душу сучаснага чалавека, абакрадзеную і спустошаную *новачасным, нічым нерэгуляваным паганствам, скуль сапраўды выходзіць усё спусташэньне на цэлы сьвет.*

Хворая людзкая душа — вось жарало ўсіх бедаў, усіх недастаткаў!

Шукаюць сяньня людзі доктара да расхварэўшагася чалавека, але слухаюць толькі нясьмелых сваім нязнаньнем фэльчароў і шаптуноў, лякарства-ж ад хваробы думаюць знайсьці ў мэханічных толькі людзкіх сілах. А хвароба тымчасам знаходзіцца ў душы чалавека і ўспомнены ўжо сьвецкі, ня духоўнік нейкі, Foerster кажа коратка, але ясна: „Чытайце Эванэлію, чытайце без упярэджаньня, а знойдзеце разьвязку сучаснага крызысу."—Душу трэба лячыць насамперш, а ня цела; трэба падсеч карэньні сучаснага крызысу — прычыны, якія гэты крызыс выклікалі, а ня бавіцца толькі ў бязмэтнае паказываньне на нямінучыя насьледкі — плады гэтага крызысу.

VIII.

Мы што сягоньня сабраліся на гэты палітычны соймік, не ад сягоньня стаім ужо на гэтым самым грунце эванэлічных праўдаў і сяньняшнія падзеі у ўсесьвеце нас толькі пераконываюць у правільнасьці занятай пазіцыі яшчэ прад 30-цю блізу гадамі, бо аж да гэтага часу, да гадоў 1902—1903 адносіцца скрысталізаваньне беларускай хрысьціянскай палітычнай думкі ў далёкіх ад нас мурох Пецярбурскай р.-к. Духоўнай Акадэміі. З Пецярбургу—праз Менск—даходзіць гэты арганізацыйны цэнтр Беларускай хрысьціянскай палітычнай думкі аж у Вільню, дзе прыняўшы аканчальныя арганізацыйныя формы, як Б.Х.Д., перажывае ўвесь час, разам з усім беларускім народам, усе ягоныя нявыгады, смуткі і радасьці, дачакаўшыся так урэшце сяньняшняга дня.—Аб ідэолёгіі БХД ня маю намеру тут гаварыць. Хацеў-бы затое падкрэсьліць тут два важныя мамэнты з найнавейшага жыцьця БХД, якія паказалі-б на прыкладзе ейную дзейнасьць, спатыканыя пры гэтай дзейнасьці перашкоды і спосабы перамаганьня гэтых перашкодаў.

Пачаткавым кругам дзейнасьці БХД было толькі беларускае каталіцкае насельніцтва. З часам аднак, калі арганізацыйны апарат партыі быў гатовы і працаваў, а праваслаўная веручая частка беларускага насельніцтва, зморaная бязупынным на яе штурмам усходняга радыкалізму і нігілізму, зьвярнулася да БХД з прапановай цеснага палітычнага супрацоўніцтва,—БХД, ў імя нацыянальнай еднасьці, не магла гэтай прапазыцыі адкінуць і прыняла яе. Гэта быў вялікі тактычны здабытак абеіх часьцін адзінага Беларускага народу. Пазыцыя БХД гэтым бязумоўна узмоцнілася і на яе пачалі з завісьцю глядзець як з боку афіцыяльнага ў нас польскага каталіцтва, так і з боку ўсходняга дамарослага радыкалізму. Першыя зразумелі сваю загрожанасьць у касьцельнай палітыцы на беларускіх землях, а другім вымыкалася з рук здабыча, якую рахавалі вось-вось падхапіць і праглынуць. Падчас калі гэтыя апошнія ў сваіх дагадках і мяркаваньнях змушаны былі аставацца ўсё роўна бязраднымі, афіцыяльныя прадстаўнікі польскага ў нас каталіцтва шукалі толькі прычыны, каб парахавацца з уплывамі БХД сярод беларускага каталіцкага насельніцтва на зах.-беларускіх землях.

(*д. б.*)

З праваслаўнага жыцьця.

Царкоўная часопісь паўкраінску будзе выдавацца праваслаўнай мітраполіяй у Варшаве, пад рэдакцыяй выдатнага укр. правасл. дзеяча Касачоцкага, сэкратара Укр. Саймавага клюбу. У часопісі будуць зьмяшчаць свае працы паміж іншымі і прафэсары Правасл. Багаслоўскага факультэту пры Варшаўскім унівэрсытэце. Маем весткі, што гэта будзе сапраўды паважная ідэолёгічная правасл. часопісь, а не мяшанка масонска-атэістычнай „гезаўшчыны,“ як у віленскім „Голасе Правасл. Беларуса.“

У Луцку вышла так-жа праваслаўная часопісь **„За Соборність“** пад рэдакцыяй Власоўскага. Часопісь гэту выдае Т-ва ім. Пятра Магілы. Часопісь носе так, як і Т-ва, полёнофільскі характар. Друкуецца ў мове расейскай і ўкраінскай. Пералавы артыкул пяра мітр. Дзяніса пад заг. „Сурсум корда“, напісаны парасейску. Зьмясьціў так-жа свой артыкул аб законнасьці супрацоўнік газэты „За Свабоду“ Сьвіцін-Туберозаў (парасейску).

Праваслаўная катэхізмоўка папольску. Даведваемся, што ў Варшаве, з багаслаўленьня сьв. Сыноду Праваслаўнае Аўтокефальнае Царквы ў Польшчы пару гадоў таму, вышла праваслаўная катэхізмоўка ў польскай мове пад загалоўкам: **Katechizm Chrześcijański Prawosławny.**“ Зразумелая рэч, што гэту катэхізмоўку будуць даваць у рукі праваслаўным дзецям, асабліва школьнікам, каб яны папольску вучыліся асноў праваслаўнай веры. А тагды ня толькі каталіцтва будзе „польскім,“ але і праваслаўе — і калі прыдзе новы сьпіс насельніцтва, то сьпісоўшчыкі змогуць пытацца і ў праваслаўнага насельніцтва, якой мовай моліцца? Словам — ня толькі ўжо ёсьць „польскае“ праваслаўе, але зараз будуць і „праваслаўні-поляцы.“

З Украінскага жыцьця.

Суд над а. Л. Куніцкім і Др Завалыкутом. У Львове, перад судом прысяжных, пачаўся суд над ведамым беларускаму віл. грамадзянству айцом прапатам Куніцкім і Др. Завалыкутом. Айцу Куніцкаму закідаюць дзяржаўную здраду і забурэньне публічн. супакою, а паміж іншым так-жа і тое, што на вечы меў прыраўняць палякоў да п'явак, якія высысаюць кроў з укр. народу і якія трэба адрываць, бо высcуць апошнюю кроў, без каторай арганізм ня можа жыць. Яшчэ а. К. меў параўняць укр. народ да 7 мільёнаў шчуроў, замкнутых у скрыні, якія маглі-б выбрацца на свабоду, каб ня грызьліся між сабою, але грызьлі сьцены тае скрыні.

Др. З. меў падбураць на месцы да непрызнаваньня Галіччыны за часьць Польшчы, меў гаварыць, што ня будзе згоды, пакуль украінцы не здабудуць самастойнасьці і меў так-жа заклікаць да гадаваньня дзяцей у духу ненавісьці.

Падсудныя пярэчаць гэтаму абвінавачаньню. А. Куніцкі сьцьвярджае, што ён ніколі ня вёў процідзяржаўнай работы, а пад п'яўкамі і шчурамі разумеў вызыск, ліхву партыйныя сваркі, якія вішчаць народ.

На суд паклікана каля 80 сьведкаў. Канца працэсу і прысуду чакаюць у гэтых днях.

Брюнінг і ўкраінцы. Укр. калёнія ў Бэрліне сьвяткавала ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Украіны. На сьвята быў запрошаны і Брюнінг, каторы на сьвята ня прыбыў, але прыслаў тэлеграму, чым як-бы прызнаў незалежнасьць Украіны. Што ў тэй тэлеграме пісалася — няма ведама, аднак сам факт прысылкі тэлеграмы зрабіў вялікае ўражаньне ў Польшчы, Саветах, Чэхаславаччыне і Румыніі, якія маюць у сваіх граніцах украінскія землі.

З Польшчы.

Процiў новага асадніцтва, якое ўзноў праектуецца на бел.-укр. землях, украінскі клюб падаў 26.I. с. г. інтэрпэляцыю, у якой востра пратэстуе процiў раздаваньня зямлі асаднікам з крыўдай для ўкр. і бел. сялян, для каторых увесь запас зямлі ў цэлым краі за-малы, каб іх дробныя гаспадаркі давесьці да такой нормы, каб яны маглі выкарміць працуючыя земляробскія сем'і. Укр. клюб пры гэтым, заяўляе, што апроч свайго урачыстага, перад усім сьветам і рашучага пратэсту, ён будзе змагацца з гэтым праектам новага асадніцкага закону ўсімі сіламі як у сойме, так і па за соймам.

Паводле новага праекту пад асадніцтва маюць быць узяты дзяржаўныя лясы і свабодныя землі, надзелы маюць давацца сем'ям забітых жаўнераў; благія надзелы маюць быць заменены на лепшыя; зямлю маюць атрымоўваць ня толькі асаднікі як адзінкі, але і арганізацыі вайсковых асаднікаў.

Ад сябе скажам, што ў свой час беларусы і ўкраінцы ня ўмелі ці не маглі абараніць для сябе свае зямлі, не разумеючы нават важнасьці гэтай абароны, а цяпер... асталося толькі пратэставаць процiў асадніцтва і глядзець, як дзеляць нашую зямельку. Сумна!

Бюджэтныя труднасьці. З прамовы міністра скарбу Яна Пілсудзкага даведваемся, што незаплачаных падаткаў ёсьць 1 мільярд 181 мільёнаў зл. З гэтай аднак сумы спагнаць праз сэквэстр можна толькі 200 мільёнаў. — А дзе рэшта і хто іх не заплаціў? Польскія газэты падаюць, што з падаткамі найболей адстаюць магнаты і абшарнікі. Уведзены нядаўна збор падаткаў у натуры ня даў пажаданых рэзультатаў. Адкладу ў сплаце падаткаў урад даваць ня думае. Падаткі пасярэднія (манаполь на сьпірт, тытун, сярнікі і г. д.) паменшалі на 40 прац. Дзеля гэтага трэба шукаць новых спосабаў ападаткаваньня насельніцтва.

Уложаны бюджэт прызнаюць усе за нерэальны, нават пасол з ББ (Палякевіч) цьвярдзіў, што бюджэт на 1932 год ня мае пад сабою грунту.

Даход прадбачыцца ў суме 2 мільярдаў 372 мільёнаў, а расход 2 мільярды 446 міл., значыць дэфіцыту ёсьць 74 мільёны злотых.

На Горным Сьлёнску ідуць перагаворы паміж прамыслоўцамі і работнікамі. Прамыслоўцы абніжылі зар. плату на 8 проц.

У Лодзі забастоўка трамвайнікаў выгасае.

З заграніцы.

Літва-СССР Польшч. З прычыны польска-савецкіх перагавораў аб ненападаньні, літоўская ковенская газэта „Lietuvos Aidas“ (афіцыёз літоўск. ўраду) піша, што ў часе гэтых перагавораў была закранута і справа Віленшчыны, якая паводле літоўска савецкага трактату з 1920 г., а так-жа пакту аб ненападаньні з 1926 г. была прызнача Літве. Саветы — піша тая газэта — катэгарычна адмовіліся прызнаць за Польшчай Віленшчыну, што амаль не прывяло да зрыву польска-савецкіх перагавораў. Аднак пад націскам Францыі, Польшч уступіла і згадзілася абыйсьці справу Віленшчыны маўчком і ў пакт не ўстаўляць. У гэтым „Lietuvos Aidas“ бачыць вялікую літоўскую перамогу.

Газэта падае, што такімі спорнымі тэрыторыямі, апроч Віленшчыны, ува Усходн. Эўропе зьяўляюцца: Бэсарабія і Гданскі карыдор.

Пад націскам Францыі. Як падаюць заграніччныя газэты (Berliner Tageblatt) ня толькі Польшч падпісала з СССР пакт аб ненападаньні пад націскам Францыі, але пад такім-жа націскам знаходзіцца і Румынія. Дагадваюцца, што Францыя, пасьля падпісаньня ўсімі яе саюзьнікамі пактаў з СССР зробіць „націск“ на Нямеччыну, каб прымусіць яе далей плаціць адшкадаваньні.

Сетка дагавораў і пактаў, якімі цяпер апутваецца ўся Усходн. Эўропа, зварочвае на сябе ўвагу цэлага сьвету.

У Парыжы гавораць аб вайне. З прычыны адказу Нямеччыны плаціць ваенныя адшкадаваньні, Францыя гатовіцца да рашучых крокаў. Францускія газэты ўжо пішуць аб „санкцыях“ адносна Нямеччыны. „Санкцыі“ гэтыя адносяцца да тых пунктаў Вэрсальскага трактату, якія, на выпадак адказу Нямеччыны споўніць ўсе варункі, пазваляюць Францыі заняць заходнія часткі Нямеччыны (Надрэйнскія правінцыі). А з заняцьцем гэтых правінцыяў, калі немцы адтуль дабравольна ня ўступяць, можа пачацца і вайна.

W. A. 4)

Kaniok-Harbuniok.

VIII.

Adzin raz — było u świata —
Staršy brat haściŭ u swata:
Tam napiŭsia da paŭśmierci.
Pryčapiliś k jamu čerci.
Wot pa poli jaho wodziać,
Kličuć, pchajuć, drażniać, zwodziać;
Pa bałocie paciahali,
Pośle ŭ rečcy pakupali;
Stul zahnali na kurhan,
Pośle pchnuli ŭ bałahan
Hladź Daniła: dziwa, dziwa!
Dwoje dobrych, trećcia krywa:
Tyja koni — uch, cha-cha!
Hety — prosta jak błycha.
Tyja warty sto rubloŭ,
Hety — moža piać hrašoŭ?...
Rostam całyja try piadzi,
Horb na karku, hob na zadzie,
Wušy doŭhi, sam krywy
Ad chwasta da haławy.
„Nu, ciapier ja razhadaŭ,
Hdzie durny naš prapadaŭ!“
Kaža sam sabie Daniła...
Uwieś chmiel z jaho adbiła.
Woś Daniła biažyć ŭ chatu,
Pad sakretam kaža bratu:
„Bačyŭ ty, jakich kanioŭ,
Jakich słaŭnych žarabcoŭ,
Bałwan, durań, naš Iwan
Ŭziaŭ schawaŭ u bałahan?“
Tut Daniła, tut Haŭryła —
Jak ich pole tam nasiła? —
Latuć prosta ŭ pieraboj:
Praz harody, krapiwoj —
Parać nohi, bjuć kaleni,
Praz płaty i praz biarwieńni,
Skačuć, padajuć u roŭ,
Ustajuć, latuć iznoŭ...
Až pabiehli ŭ bałahan,
Hdzie kaniej schawaŭ Iwan.
Tut i wočy adčynili,
Doŭha tak nie hawaryli,
A pawiesili ŭ chadu
Jazyki na baradu.
Koni tyja, jak čaroŭny:
Jak adzin — abodwy roŭny —
Hrywy—prosta załatyja,
Jak duha, krywaja šyja,
Wočy čorny, poŭny žaru...
(Och, kab mnie takuju paru!)
Šerść u jabłyki pabita,
Dy pryčesana, pamyta,
Bliščyć jasna, jak u lustry,
Koni rezwy, bojki, šustry —
Bjuć ab ziemlu kapytami;
A braty nia znajuć sami,
Što rabić? ci tut astacca?
Hdzie, kaho, ab čym pytacca?
Choć wialiki rozum mieŭšy,
Tut stajali, jak zdurnieŭšy...
Až pramowiŭ brat Daniła:
„Kab jaho niačysta siła!
Skul Iwan takich kanioŭ,
Brat ty moj, siudy prywioŭ?“
A Haŭryła toj paroju
Kiwaŭ mudraj haławoju:
Jašče pośle ad tych rečaŭ
Paskrabaŭsia nižej plečaŭ.
„Bač, jakija, kaža, štuki!
Durnym ščaście lezie ŭ ruki.
Ty, jak ryba, ab lod bješsia,
Jak duha prad dolaj hniešsia,
Zrobiš propaść tej raboty,
A zarobiš... paru złoty!
Durny Janka piaje pieśni:
Kryčyć, šelma, čuć nia treśnie;
Jamu-ž ščaście, jak toj źwier,
Samo lezie za kaŭnier!

IX.

Tut razumny brat Daniła
Kaža cicha: „Słyš, Haŭryła!
Durniaŭ tut miž nas niamaš:
Budzie ŭ horadzie kirmaš;
Mnoha budzie tam kupcoŭ. —
Woźmiem hetych žarabcoŭ,
Pradadziom, padzielim hrošy...
Za taki tawar charošy
Woźmiem choć i sotniaŭ piać.
Možna budzie pahulać!
A chto hrošy mnoha maje,
Toj razumny, toj hulaje!
A jak wypješ, moj ty bracie,
Jak ciabie wiasiołaść chwacie —
Ci kamieńni, ci biarwieńni —
Tabie mora pa kaleni!
Jak ubačyš hdzie pjanoha,
Nie čapaj, jak i światoha.
Nawat dzieci heta znajuć —
Usie pjanomu ustupajuć.
A dla Janki-duraka
Chwacić hetaha Kańka:
Jon mały, krywy, łachmaty —
Budzie Janka im bahaty!

Tut braty u miłaj zhodzie
Stali ŭ hetakaj pryhodzie
Miž saboj za ruki bracca,
Abymacca, caławacca;
Što až koniam było śmiešna,
Jak ściskalisia paciešna —
Usie try zarahatali
I chwastami zamatali.

(d. b.)

Аб вайне гаворыць ня толькі Францыя, але і саюзьніца яе — Чэхаславаччына. І так — чэскі пасол Шпачэк, на паседжаньні вайсковай парлямэнтарнай камісіі заявіў, што трэба лічыцца з настаньнем вайны ў найблізэйшай будучыні і што калі пачнецца вайна, то Чэхаславаччына возьме у ёй учасьце... З усяго відаць, што Францыя, разам з сваімі саюзьніцамі, прыгатаўляе проціў Нямеччыны нейкае выступленьне.

Польска-румынская дружба. Польскі ўрад зьвярнуўся да румынскага ўраду з афіцыяльнай заявай, што тагды толькі падпісаны з СССР пакт аб ненападаньні ўвойдзе ў жыцьцё, калі такі самы пакт будзе падпісаны паміж СССР і Румыніяй.

„Сьледчая камісія“. Ліга Народаў выбрала „сьледчую камісію“, якая мае паехаць у Кітай і дасьледзіць усё на месцы. — Пакуль яна туды даедзе, пакуль абсьледзіць і пакуль вернецца, то Японія мусіць скончыць з Кітаем, калі не ўмяшаюцца іншыя дзяржавы.

Польска-літоўскі спор перад Радай Лігі Народаў скончыўся тым, што Рада прыняла да ведама прысуд Міжнародн. Гаскага Трыбуналу, які прызнаў за Літвою права не адкрываць чыгункавых зносін з Польшчай, пакуль ня будзе вырашаны літоўска-польскі спор за Віленшчыну. Пры гэтай нагодзе мін. Заўніус сказаў абшырную прамову, што Польшч, забраўшы Вільню, перашкодзіла Літве навязаць з ёю нармальныя зносіны. На гэта мін. Залескі адказаў, што ён справы Вільні дыскутаваць ня будзе.

Японія і СССР. Мы ўжо пісалі, што Японія ня хоча заключаць пакту аб ненападаньні з СССР, хоць Саветы гэтага дамагаюцца. Месяц таму, калі нованазначаны міністар замежных спраў Японіі Ёшызава (быўшы японскі дэлегат пры Лізе Народаў) праяжджаў праз Маскву, савецкія дыплёматы стараліся ўгаварыць яго пачаць перагаворы аб пакце ўзаемнага ненападаньня, але хітры япончык толькі заяўляў, што Японія ніякіх зачэпных намераў адносна Саветаў ня мае... Трэба ведаць, што Ёшызава вельмі здольны дыплёмат (праз 4 месяцы вадзіў за нос усю Лігу Народаў і ў канцы паставіў на сваім) і належыць да ваеннай партыі, на чале якой стаіць цяперашні японскі прэм'ер Інукай. Калі пры выбарах 20.II. гэтая партыя здабудзе большасьць, трэба спадзявацца з боку Японіі рашучых чынаў адносна Саветаў і адносна Злуч. Штатаў Паўночнай Амэрыкі.

Да нас пішуць.

СУМНАЕ ЗЬЯВІШЧА.

Слонім. Бываючы на рынку нельга не заўважыць вялікага наплыву на рынак збыту жывёлы. Але гэта ня тыя часы, калі наш селянін прыводзіў на рынак жывёлу лішнюю ў гаспадарцы і празначаную плянова на продаж. Нармальна, селянін прыводзіць на рынак укормленую слабадзіну, прывозіць укормленых сьвіней і іншую дробязь. Цяпер наадварот. На рынку заўсяды жывёлы поўна, але яна худая, або ледзь падгладжаная. Збываюць сяляне ўсё, абы-абы збыць. Пакуль селянін збудзе на патрэбы падаткаў худаватую слабадзіну, або сьвінчо, разоў са тры прывядзе ці прывязе яе на рынак, бо такая таніна, амаль ня дарма мусіць аддаць, каб толькі збыць.

Сяляне стогнуць, на ўсё і ўсіх, наракаюць і пытаюцца: калі гэта кончыцца і што з гэтага будзе?

У вёсках вечарамі рэдка ў якой хаце ўбачыш асьвятленьне, сядзяць у поцёмку, бо няма за што купіць карасіны. Многія ядуць ужо бяз солі, бо і гэты „прадукт“ нашаму селяніну ўжо недаступны.

Нягледзячы на гэта, падаткі зьбіраюцца інтэнсыўна, хоць без „інтэнсыўных“ рэзультатаў, бо ня мае чым селянін плаціць. Апрача падаткаў, націскаюць і пазыкі ў „Касе ошчэндносьці.“

Агульнае палажэньне сялян вельмі цяжкое і найгорш, што сяляне губляюць надзею на паправу.

Сяляне з вёсак прыходзяць у места шукаць работы, каб зарабіць хоць на соль, аж у горадзе ёсьць і сваіх безработных, так што зьеўшы ў месьце торбу — запас ежы, варочаецца селянін дамоў ні з чым. У вёсцы людзей поўна, дык і ходзяць мужчыны, як навабранцы, ня ведаючы за што і рукі зачапіць. Ня маючы чым паважнейшым заняцца, гоняць тайна самагонку і п'юць. Гэтая пошасьць вельмі пашырылася сярод нашага сялянства.

Браты сяляне! Ня гэта дарога да выхаду з сучаснага цяжкога нашага палажэньня. Самагонка нас яшчэ больш прытупіць у змаганьні з злыбядой. Выкарыстайма гэты час прымусовага гультайства на прасьвету над сабой.

Чытайма свае газэты, кніжкі, арганізуймася, а прыдзе час і лепшых дзён. В.

ЦЯЖКОЕ ЖЫЦЬЦЁ Ў НАС.

Палікшы, Маладэчанскага пав., Рагаўскай гм. Наша вёска знаходзіцца каля самай Савецкай граніцы, дык нашаму селяніну без дакумантаў ані выйдзі. Як толькі вышаў, дык зараз і пытаюцца „сконт пан?“ Гэта ў дзень, а ў ночы, дык і дакумант не памагае; абы злавілі чалавека дык і „настражніцу,“ а адтуль у паліцыю, там дапрос, а пасьля і штраф Нашы сяляне, як толькі сьцямнее, дык і з хаты ня выходзяць.

Толькі вучыцель стараўся ў нас заладжыць „кулка млодзежы“ і абяцаў наладзіць курсы для дарослых, але наша моладзь туды не пашла. Цяпер пачалі арганізаваць „стшэльцаў“ і запрашаць нашу моладзь на „стражніцу,“ але яна і туды баіцца заходзіць.

У мінулым годзе ня было ў нас ураджаю. Многім трэба было купляць жыта і на пасеў. Дзеля гэтага пачалі людзі старацца грошаў. Пазычылі неяк у гміне за вэксалі на 100 зл. па 72 зл., бо ад гэтай пазыкі адлічылі наперад процант і яшчэ нейкія ўклады. А гэтую пазыку п. войт называе таннай і помачай нашаму селяніну.

Таніна ў нас страшэнная. Адзін селянін прадаў двугодняга бычка за 28 зл., за якога 2 гады таму (цялёнка) заплаціў 35 зл.

Дык вось якое жыцьцё ў нас.

Вясёлы Сакол.

САДЗЕЦЕ КАРМОВЫЯ БУРАКІ.

Дуброва, Маладэчанскі павет. Я хацеў-бы напісаць штоколечы аб гаспадарцы. У нас ужо тры гады, як заахвочываюць садзіць кармовыя буракі. Першыя два гады людзі саўсім патроху іх садзілі, але як праканаліся, якую карысьць даюць гаспадару буракі, дык у леташнім годзе ўжо садзілі буракоў вельмі шмат, бо ў гаспадарцы нішто такога ўраджаю не дае, як кармовыя буракі. Толькі трэба ўмела каля іх даглядаць, а карысьць вось якая: каровы болей малака даюць, сьвіні лепей ядуць і скарэй уядаюцца, а ў сёлетнім цяжкім годзе, дык добра прыдзёрці іх і да хлеба і дужа шмат яшчэ да чаго яны прыдатны. Калі-б хто хацеў мець добрыя буракі, а ня ведае як іх гадаваць, дык хай напіша да „Крыніцы“, то я апішу, як садзіць, як даглядаць, як прыгатаваць зямлю, каб мець добры ўраджай, бо бурак нават у дробнай гаспадарцы вялікая апора.

Я М.

ПАВАРОТ З САВЕТАЎ.

Маладэчаншчына. У восень вельмі шмат нашай маладзежы: хлопцаў і дзяўчат, з нашых вёсак ішло да бальшавікоў. На запытаньне, чаго яны ідуць,—некаторыя адказвалі, што там многа фабрык, дык вялікія заработкі, можна зарабіць у дзень якіх 8 даляраў і ўсё добра.

Але цяпер выясьнілася, што іх ашукалі. Некаторых хлопцаў здатных да стрэльбы паслалі ў Манджурыю проціў Японцаў, няздатных да стрэльбы ганялі на работу капаць бульбу, рэшта—сядзелі ў бараках пад назорам. Цяпер зьбіраюць па чалавек 50 і болей і гоняць да граніцы і перакідаюць у Польшчу. Гэтыя перакінцы выглядаюць як трупы. Некаторыя прабылі па 7—8 нядзель і бялья не зьмянілі. Бруд у іх разьвёўся, ўсёроўна што ў мураўейніку мурашкі...

Янка Макар.

Ab haspadarcy.

Małačarskija drobiazi.

„Nie za raz, kažuć, Vilnia zbudavana“ i pyšnaje siańnia kooperatyŭnaje małačarstva ŭ Zach. Eŭropie nie adrazu takim stałasia, jakim my ciapier jaho bačym i padziŭlajem. Pakul nia było małačarskich centryfuhaŭ, nia było i kooperatyŭnych małačarniaŭ, a kožnaja haspadynia abchadziłasia z małakom pachatniamu. Z henych časoŭ šmat čaho pierachavałasia, što nia raz moža być vielmi dobra zastasavanym i ŭ našyja ciažkija dni. Da takich čynnaściaŭ u pieršuju čarhu naležyć *sposab addzialańnia, abo žbirańnia śmiatany.*

Znajuć na heta važniejšyja sposaby dva: švedzki i holštynski (niamiecki). Pieršy z ich bolš pryhodny dla haspadarak bolšych, a druhi— dla mienšych.

Dla švedzkaha sposabu žbirańnia z małaka śmiatany treba mieć basejn (najlepš — muravany z cementu) na zimnuju (z lodam) vadu, a na małako — niekalki płoskich, vuskich, ale vysokich, z hruboj pacynkavanaj blachi pasudzin, z katorych kožnaja źmiaščaje ŭ sabie zvyčajna nia mienš 20—30-cioch litraŭ. Hetyja pasudziny nazyvajucca švarcoŭkami, bo vydumaŭ ich, jak i cely sposab ichnaha ŭžyćcia, šved Swartz (*čytaj — švarc).*

Praca pry pomačy švarcovak pravodzicca hetak:

Čysta nadojenaje i pracedžanaje małako źlivajecca ŭ švarcoŭki, katoryja zaraz-ža ŭstaŭlajucca ŭ ściudzionuju vadu ŭ muravanym basejnie. U ciopłym małace, pad upłyvam ściudzionaj vady, nastaje ruch, pry katorym małyja kamočki małočnaha tuku (kłustaści) vypłyvajuć na vierch i tam astajucca. Uvieś bolš-mienš małočny tuk žbirajecca hetkim čynam na viersie małaka ŭ praciahu 36-cioch hadzin. Tam, dzie hetkaje vystaivańnie małaka adbyvajecca ŭ vadzie nie ciaplejšaj 12°C, tam zvyčajna jak śmiatana, tak i sabranaje (posnaje) małako byvajuć sałodkimi: z hetkaj śmiatany možna vyrabić darahoje, sałodkaje, h. zv. harbatniaje masła, a samo posnaje małako dajecca jšče varyć.

Pry švedzkim sposabie Swartza atrymoŭvujecca 10—20 proc. śmiatany ŭ paraŭnańni z kolkaściu užytaha małaka.

Dla holštynskaha sposabu žbirańnia śmiatany treba mieć: dobry, prastorny sklep, z bolš-mienš stałaj temperaturaj (10—15°C), vialikija, ale niskija, płoskija misy na małako i adumysłovuju žbiračku, (płoskuju łyžku) na śmiatanu. Razmiery misak byvajuć takija, kab źmiaščili ŭ sabie 2—7 litraŭ, a ŭvyški dasiahajuć tolki 4—6 cm.

Čas ustaivańnia śmiatany byvaje toj samy, što i pry sposabie švedzkim, h. zn. 36 hadz., a śmiatany pry hetym atrymoŭvajecca tolki 10—12 prac., znača — mienš, čymsia pry sposabie papiarednim, ale zatoje jana tut „huściejšaja“, abo lepš — kłuściejšaja.

inž. A. K.

Наша пошта.

Шчыраму Беларусу. За карэспандэнцыі дзякуем, скарыстаем, пішэце часьцей.

М. Палачанскаму. Дзякуем, скарыстаем, пішэце часьцей. Залажыце ў сябе гурток Бел. Інст. Гасп. і Культ. Калі хто будзе ад Вас у Вільні, няхай зойдзе да нас, дык мы перашлём Вам кніжак

Вясёламу Сокалу. За карэспандэнцыю дзякуем, скарыстаем, пішэце больш.

У. З—чу. Дзякуем, скарыстаем, праўную параду выслалі пісьмом.

М. Цыбульскі. З прысланага скарыстаем, дзякуем, пішэце часьцей.

В. А. з Яськавіч. Газэта Вам пасылаецца акуратна, адказ на запытаньне далі ў № 2 „Б. К.“. Ажывіце дзейнасьць гуртка БІГіК. Вам у гэтым паможа гр. Сяргей.

Расьлянскаму. Дзякуем за карэспандэнцыю, карыстаць будзем, пішэце як можаце.

Д. Б. Атрымалі, дзякуем, скарыстаем.

Сялянскаму сыну. Дзякуем, карыстаць будзем, пішэце больш.

Макаўлянцу. Карэспандэнцыю атрымалі, дзякуем, скарыстаем. Адрасоў гэтых укр. часопісаў ня ведаем.

Шпаку. Атрымалі, дзякуем, скарыстаем.

Гарбуковічу. Просьбу Вашу перадалі ў кнігарню „Пагоня“ — Wilnia, Zawalnaja 6—10.

Ш. Музыка. За прысланае дзякуем, скарысталі, пішэце больш.

Сімкаўскаму. Дзякуем, карыстаем, пішэце

Грошы атрымалі ад: Браўковіча 4 зл., Дыр. Навагрудзкай Бел. Гімназіі 4 зл., Ул. Жабёнак 3 зл., Ф. Ждана 1 зл., Я. Шышкевіча 2 зл., М. Рындзевіча 2 зл., П. Зеновіча 1 зл., Кс. Борыса 4 зл., Я. Ав. 1 зл., А. Скорубіса 2 зл., Др. Грынкевіча 5 зл., А. Стэльмашэнка 4 зл. і Р. Сьлезьняка 60 гр. — дзякуем, газэту пасылаем

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.